Created in Master PDF Editor - Demo Version

Жанравая шматстайнасць сучаснай беларускай паэзіі: трансфармацыя паэтычных форм

СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ, ЖАНРАВАЯ ШМАТСТАЙНАСЦЬ, АЎТАРСКІ ЖАНР, ТВОРЧЫ МЕТАД, ВІЗУАЛЬНАЯ ПАЭЗІЯ, МЕДЫЯПАЭЗІЯ, ЖАНРАВЫ СІНКРЭТЫЗМ, ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ

Жанравая шматстайнасць сучаснай беларускай паэзіі: трансфармацыя паэтычных форм [Тэкст]: Справаздача аб НДР (заключ.): / БДПУ; адк.вык. Мотрэнка Т.А. - Мн., 2018. - 58 с., 1 іл., 2 дадаткі - Бібліягр.: С. 50-54 (45 назв.). - № ДР 20180443.

**Аб’ект** – сучасная беларуская паэзія ў аспекце праблемы жанравай трансфармацыі.
**Мэта** – праз аналіз творчасці сучасных беларускіх паэтаў выявіць асаблівасці трансфармацыі жанравай сістэмы беларускай паэзіі канца ХХ – пачатку ХХІ стст.
**Метады.** Метадалогія даследавання грунтуецца на сістэмна-тыпалагічным, комплексным падыходзе да літаратурна-эстэтычных з’яў, на дасягненнях параўнальна-гістарычнага літаратуразнаўства, герменеўтыкі, тыпалогіі, на біяграфічным, культурна-гістарычным, сацыялагічным, псіхалагічным, структурным метадах.
**Вынікі.** Распрацавана метадалогія аналізу сучаснай беларускай паэзіі ў аспекце праблемы жанравай трансфармацыі; здзейснены аналітычны агляд беларускай паэзіі на этапе змены жанравай парадыгмы, у тым ліку: высветлены дэтэрмінанты трансфармацыйных працэсаў у жанравай сістэме сучаснай беларускай паэзіі; вызначаны асаблівасці жанраўтварэння ў межах аўтарскіх літаратурных канцэпцый; абгрунтавана і раскрыта роля тэхнічнага прагрэсу ў працэсе змены жанравай парадыгмы сучаснай беларускай паэзіі; прааналізаваны механізмы функцыянавання запазычаных жанравых форм на беларускай паэтычнай глебе.
**Ступень укаранення.** Вучэбны працэс БДПУ.
**Вобласць выкарыстання.** Павышэнне якасці літаратурнай адукацыі школьнікаў, навучэнцаў ССНУ і студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ праз удасканаленне і актуалізацыю вучэбна-метадычных матэрыялаў па вывучэнні жанравай шматстайнасці сучаснай беларускай паэзіі; далейшае развіццё беларускага літаратуразнаўства ў накірунку вывучэння праблемы трансфармацыі паэтычных форм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version